Федарэнка М.М. студ. гр. 514 ФТБК і СМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М.,
канд. філал. навук, прафесар

# ГУЛЬНЕВЫЯ ДЗЕІ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ СВЯТ : ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Святочна – гульневая культура ўносіць навізну і яскравасць у наша паўсядзеннае жыцце, нясе радасць як сродак зносін і пераўтварэння навакольнага свету,фарміруе чалавека як суб'екта культуры.У нашым грамадстве вялікая ўвага надаецца развіваюча – выхаваўчаму патэнцыялу культуры, а у сучасны момант у інтэнсіўна пераменлівым грамадстве праблемы свята і гульніі маюць асаблівае значэнне : яны – вельмі складаныя і важныя, апекты сферы культуры і адукацыі.

Кожны народ мае свае самабытныя гульні, якія адлюстроўваюць яго характар. Яны цесна звязаны з бытам іх працоўнай дзейнасцю людзей, і навакольным асяроддзем.Беларускія народныя гульні маюць шматвяковую гісторыю.Значны уплыў на фарміраванне беларускіх народных гульняў,аказалі старажытнаславянскія рэлігійныя святы, якія суправаджаліся выкананнем розных рэлігійных практыкаванняў, уключалі гульні і спаборніцтвы.Летапісныя помнікі сведчаць аб масавым характары ігрышчаў, якія ў пэўнай ступені з'яўляліся аглядам фізічнай падрыхтоўкі моладзі ( напрыклад (Нестараўскі летапіс).Цяпер слова ” гульня” адыйшло ад свайго старажытнаславянскага паняцця як " спявання са скокамі" і больш набыло значэнне занятку з мэтай забавы і адпачынку, які звычайна заснаваны па пэўных умовах і правілах.Для яе існуе наступнае азначэнне маючы на ўвазе ,што гульня – гэта, ў першую чаргу,дзея, у якой есць сэжэт.Народныя гульні- від актыўнага адпачынку чалавека, гістарычна сфарміраванага на аснове драматызаваных, умоўных або творчых дзеянняў, у якога склаліся пэўныя правілы і прыемы забаў , якія з'яўляюцца сродкам фізічнага, розумовага і маральна – эстэтычнага выхавання.

Вялікая група беларускіх народных гульняў мела пастаянную прымеркаванасць да пэўных дат.Напрыклад ” Ваджэнне казы”, адбывалася толькі на Каляды,гулянне ў біткі, катанне яек – на Вялікдзень і г.д. Каляндарныя і сямейна – абрадавыя гульні з’яўляюцца найбольш кансерватыўным і архаічным пластом народнай спадчыны, у якім добра захаваліся сляды міфалагічных уяўленняў чалавека,язычніцкіх культаў старажытнасці.Найбольшая шчыльнасць гульняў у зімовым перыядзе прыпадае на Каляды.І найперш з іх вылучаецца абрадавая гульня – дзейства ” Ваджэнне казы”, асабліва распаўсюджанна на паўднева – усходняй частцы Беларусі з дамініруючым цэнтрам бытавання на Палессі.Песні пра казу заклікалі на шчодры прыклад жывелы, добры ўраджай, у песнях пра казу бачылася шмат язычніцкіх міфічных рысаў.У смерці яе і ўваскрэсенні, відавочна увасабленне памірання прыроды зімой і яе нараджэннем з прыходам вясны. Пераапрананне ў звяроў ( казу , мядзведзя, каня) у перыяд першага тыдня году лічылі праяўленнем, слядоў культу Велеса – Воласа.

Гульня “ Яшчар” ( “ Яшчур”) з’яўляецца таксама адной з старажытных гульняў.У гульні праяўліся рэшткі ахвяравання духу падземнага царства водаў, яму прыводзілі ахвяру,у выглядзе прыгожых дзяўчат. Вясна, згодна беларускага народнага календара, была пачынальніцай астранамічнага года. Напрыклад ігрышча “ Гуканне вясны”, што найчасцей успрымаецца ўжо не як абрадавы рытуал, а комплекс традыцыйна - нацыянальных гульняў і забаў , асабліва характэрных для Палесся.Гэта – звычай сустрэчы вясны з караваем, вянком, печывам у выглядзе птушак, звязаны з аграрнай магіяй, культам бостваў нівы, жывел і дрэў.Ігрышча “ Ваджэнне і пахавання стралы” – старажытны магічны абрад, які ў сучасным бытаванні ўспрымаецца як вяселая народная гульня, выконвала , ахоўна – засцерагальную і магічна – аграрную ролю ( праводзіўся на Вялікдзень, Юр’я, Ушэсце ).Семушная (траецкая) пара не багата на разнавіднасці гульняў.Тут выдзяляецца завіванне вянкоў, ігрышча , у якім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звычайна прымалі удзел дзяўчаты, адбывалася дзянне ў бярозавым гаі, гульневыя варожбы па засохлых галінках, апушчаных на бягучую ваду вянках.Самым значным святам у летні перыяд з'яўлялася Купалле.Уяўляецца, што язычніцкія забавы ў купальскую ноч святкаваліся ў гонар сонца, агню, Перуна( Ярылы). На Пятроў дзень дзяўчаты ішлі ў лес развіваць вянкі, якія завіваліся на Семуху, у гэты дзень апошні раз гужкаліся на арэлях летам.У жніўных абрадах вылучаліся некаторыя гульневыя моманты: завіванне барады, пляценне вянка гаспадару і інш.Восень не вылучала якіх небудзь адметных гульняў і забаў, таму што наступаў час цяжкай працоўнай пары.Але з некаторай урачыстасцю праходзілі Зажынкі і Дажынкі, а самым вялікім восеньскім святам былі Багач і Пакровы.З Пакроў пачыналася самая лепшая пара – людзі весяліліся і ладзіліся Вяселлі.Гаворачы пра гульні беларускага народа , трэба звярнуць увагу на абрадавыя гульні.У абрадавых гульнях больш яскрава, чым у іншых,адлюстроўвюцца традыцыі і культура народа.У іх спалучаюцца драматызацыя, песеннасць, паэтычнае аздабленне з пластыкай і спартыўнасцю.Такія гульні – прадстаўленні разыгрываюцца па ўсіх правілах драматычнага мастацтва.Як у сапраўдным прадстаўленні, у гульнях нароўні з галоўнымі ролямі, з тымі хто вядзе прадстаўленне, вялікае месца адводзіцца радавым ўдзельнікам: натоўпу, а выканаўцы самі з'яўляюцца адначасова і гледачамі.У абрадавых гульнях дзейнічаюць прадстаўнікі жывельнага свету, яны звязаны з прыродай, бытам беларусаў і дапамагаюць успрымаць мастацкае слова ў сувязі с сітуацыйнымі дзеяннямі, развіваюць фантазію, даюць прастору для творчай ініцыятывы.Сюжэт і змест гэтых дзействаў вызначаны традыцыяй, але аздабленне дыялогу паэтычнымі дэталямі, залежыць ад мастацкіх зхдольнасцей ўдзельнікаў.Удзел у гэтых гульнях уводзіць не толькі ў стыхію народнага мастацкага жыцця,але і выхоўвае погляд на свет, этычныя і маральныя правілы, выпрацаваныя нацыяй і ўсвядомленыя ею як неабходнасць пры фарміраванні нацыянальнага характару.Паколькі народная гульня – гэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльны феномен,у якім умоўна адлюстроўваюцца рэчаіснасць, то з развіццем грамадскай свядомасці змяняецца і змест гульняў.На цяперашні час вяселыя гульневыя святы ўжо больш выцясняюць афіцыйнай ўрачыстасцю , чужыя гульні( тэхнічныя,камп'ютэрныя, інтарактыфўныя).Сталі забывацца шматлікія гульні, існуючыя пераважна як святочныя, напрыклад карагодныя, гульні – пераплясы, народныя забавы.Адраджэнне святочна – гульневай культуры застаецца неабходнасцю.Святы маюць высокі сацыяльны статус, атрымліваюць для сябе сродкі, час, месца, афармленне рэжысераў, чаго нельга казаць пра пераважную колькасць гульняў.На сучасным этапе робяцца шмат крокаў па адраджэнні святочна – гульневай культуры, прыярытэт надаецца больш" новаму", чым традыцыйнаму.Гэта назіраецца не толькі у гарадах,але і сельскай мясцовасці.Амаль паўсюдна зніклі традыцыйныя абрадава - рытуальныя і гульневыя дзеі святаў Семухі і Юр'я, а цікавыя старажытныя святы як Камаедзіца, Ляльнік, Багач увогуле зніклі з сучаснага абрадава – святочнага календара.Напрыклад на традыцыйную абраднасць зімовага цыклу беларусаў, сення даволі моцна уплывае і захоўваецца трыдыцыйная абраднасць еўрапейскіх народаў( каляды – усталяванне навагодняй елкі, навагодні маскарад з дзедам марозам, санта – клаусам.) На сучасным этапе працэс пераасэнсавання і трансфармацыі гульневых форм да сучаснага успрымання, можна з упэўненасцю казаць пра вялікі крок наперад, гэта цікава, відовішчна, але губляецца першапачатковая значнасць традыцыйных( народных ) беларускіх персанажаў ( асілкаў, персанажаў казак, паданняў, міфалогічных герояў, герояў легенд).

Многія сцэнарысты і метадысты , якія ствараюць сцэнарыі і разработкі, звяртаюць увагу на знешнія адметнасці персанажаў, не улічваючы іх характар, асабістыя якасці, выхаваўчы патэнцыял героя.

Важна ў абрадава- гульневых дзеях у задуму закласці такое вобразна – гульневае дзеянне, якое пры рэжысерскім увасабленні выклікала б асацыяцыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія маюць пад сабой рэальную аснову.Калі мы правільна знойдзем у абрадава гульневых дзеях асацыятыўныя вобразы, гэта дазволіць нам стварыць атмасферу свята,наладзіць актыўны эмацыянальны настрой гуляючых.Дзякуючы традыцыйным персанажам святочна – абрадавай культуры, гульні і гульнёвыя дзеі не губляюць сваю цікавасць , значнасць, яны нясуць у сабе інфармацыю, якая на працягу стагоддзяў адлюстроўвала гісторыю развіцця і стаўлення культуры беларусаў.Традыцыйныя героі нясуць у сабе цікавыя звесткі, яны надзелены інфармацыяй, якая неабходна для выхавання сапраўднага грамадзяніна сваёй краіны.На сёняшні дзень праводзяцца розныя конкурсы і фестывалі, якія накіраваны на адраджэнне культуры беларусаў.Абавязковай умовай правядзення такіх мерапрыемстваў з’яўляецца выкарыстанне сюжэтаў з удзелам традыцыйных герояў, напрыклад: Фестываль народнага гумару ( Каласок і Калінка), “Беларускі вянок” ( Ясь і Яніна),але гэтага не шмат.

Прааналізаваўшы навуковую, мастацкую літаратуру прапануем ствараць на базах устаноў культуры і адукацыі банка дадзеных, на аснове якога будуць распрацоўвацца і ствараццца сцэнарыі, зборнікі метадычных распрацовак, розныя дапаможнікі для арганізатараў ,стваральнікаў свята і рэжысёраў, не толькі ў абласных цэнтрах,але і раенных і сельскіх дамах культуры.

Прапануем выяўляць і падрыхтоўваць зацікаўленных спецыялістаў у галіне адраджэння народных гульнёвых традыцый, здольных несці гэта на высокім эстэтычным і мастацкім узроні ў шырокае кола рознаўзроставай аўдыторыі, у Рэспубліцы Беларусь і па за яе межамі.

Літаратура:


1) В.К.Бандарчык “ Беларускія народныя гульні” Мінск 1996г

2) Я.Р.Вількін “ Беларускія народныя гульні” Мінск 1969г.

3) Пад рэд. Н.І. Мірончык “ Беларускія народныя гульні” мінск 1993г.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А.М.Аляхновіч “ Беларускі дзіцячы фальклор” мінск 1994г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ